3. Mickiewicz, A. Dzieła poetyckie. Wiersze / A. Mickiewicz. – Warszawa: Czytelnik, 1983. – T. 4. – 393 s.
4. Колас, Я. Збор твораў: у 14 т. / Я. Колас. – Мінск: Маст. літ., 1974. – Т. 6. – 614 с.

*УДК 821.161.3.09(092)Купала*

# ТЭМА БУДУЧЫНІ РОДНАГА КРАЮ Ў ПАЭЗІІ ЯНКІ КУПАЛЫ

**Г. М. Мятліцкая**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*romannose@tut.by*

У артыкуле разглядаецца паэтычнае асэнсаванне Янкам Купалам тэмы будучыні Беларусі. Аналізуюцца нацыянальныя аспекты творчасці класіка: матывы і вобразы, звязаныя з адвечнымі марамі беларусаў аб шчаслівай будучыні краіны, неабходнасцю служэння творчых людзей радзіме, шанавання роднай мовы і інш.

*Ключавыя словы:* беларуская гісторыя; патрыятызм; мастацкі час; будучыня; прарочыя матывы.

# THE FUTURE OF THE NATIVE LAND IN THE POETRY OF YANKA KUPALA

**H. M. Miatlitskaya**

*Belarusian State University*
*Minsk, Republic of Belarus*
*romannose@tut.by*

The article deals with Yanka Kupala's poetic comprehension of the future of Belarus. The national aspects of Yanka Kupala's work are analyzed: motifs and images associated with the eternal dream of the Belarusian people about a happy future of the country, the need for creative people to serve their motherland, the reverence for their native language, and others.

*Key words:* Belarusian history; patriotism; artistic time; future; prophetic motifs.

Творчасць Янкі Купалы ўспрымаецца сённяшнімі чытачамі з улікам яе гістарычнай дакладнасці і канкрэтнасці: як своеасаблівы мастацкі летапіс, пакінуты песняром у спадчыну будучым пакаленням беларусаў.

Жыццёвы і творчы лёс Янкі Купалы прыпаў на час зменлівы і імклівы, надзвычай насычаны «пераломнымі», падчас трагічнымі момантамі гісторыі. Бачанае і перажытае ў час рэвалюцый, Першай сусветнай вайны, знішчэння манархіі і ўтварэння СССР аказала свой уплыў на фарміраванне творчай індывідуальнасці паэта. Кожны гістарычны этап суправаджаўся якаснымі зменамі ў жыцці беларусаў у параўнанні з ранейшым. Па творах класіка можна прасачыць асноўныя «вехі» беларускай гісторыі 1905–1942 гг. Мара пра надыход шчаслівай будучыні народа і краіны ў цэлым, якая ўзнікла на самым пачатку творчасці песняра, стала здзяйсняцца ў савецкай дзяржаве, як гэта першапачаткова здавалася тагачаснай беларускай інтэлігенцыі.

Больш як сто гадоў прароча гучаць мудрыя словы Янкі Купалы. Матывам веры ў лепшае жыццё прасякнуты творы 1906–1912 гг. і пазнейшыя. Клапоцячыся пра беларускі народ, купалаўскі лірычны герой уяўляе будучыню як багаты ўраджай на сялянскіх палях: «Людзі мруць, а ўсё ждуць // Багатшай уроды, // Мо і к нам прыбягуць // Шчаснейшыя годы. // О, тады сноп у сноп // Жніва наша будзе… // Сотня коп, мільён коп… // Дзівуйцеся, людзі!» [5, т. 3, с. 92–93], – верш «Чым хата багата». У вершы «Сваякам па гутарцы» лірычны герой заклікае людзей

верыць у будучае лепшае жыццё, бо «народ магучы», «не зломкі» і «не зноскі», кажа сялянам: «Ваша панства – вашы вёскі, // Пан ваш – труд жывучы» [5, т. 3, с. 93]. У фінале твора паэт выказвае ўпэўненасць у тым, што жыццё зменіцца да лепшага:

Рухне крыўда, праўда ўстане,
    Ворагаў адстраша,
Будзе долі панаванне
    На зямлі на нашай [5, т. 3, с. 94].

Магутны голас віхору, з аднаго боку, грозна даводзіць аб панаванні гора, людской бяды, слёз (верш «Віхор загуляў», 1906), а з другога – паэт пераканаўча сцвярджае, што віхры сціхнуць, будуць новыя, вольныя, шчаслівыя песні (верш «Беларушчына» (1908) і інш.). Вера ў заўтрашні дзень дае лірычнаму герою сілы жыць, «думы гартуе ісці, не чакаць», ён прызнаецца, што да канца жыцця будзе ісці па сваім шляху, «непакорна, шукаючы ўсё» [5, т. 3, с. 99–100] (верш «Шлях мой…», <1906–1912>).

Трактоўка рэчаіснасці паэтам у ранні і нашаніўскі перыяд творчасці адзначаецца тыпова рамантычнымі супярэчнасцямі: Купала ўспрымае навакольнае жыццё праз рамантычны вобраз разладу паміж рэальным і ідэальным, разрыў паміж якімі без якасных змен у грамадскай свядомасці бачыцца непераадольным. Сучасная паэту рэчаіснасць і ў цэлым жыццё беларускага народа паказаны праз вобразы залому, сну, ночы. «О ноч! о бесканечны твой над намі ход! // Калі ж пакінеш ты туманіць наш народ!» [5, т. 3, с. 201], – напісаў Янка Купала ў вершы «Валачобнікі» (1914). Персанажы твораў імкнуцца пераадолець «замкнёнае кола» свайго жыццёвага існавання, але ў іх гэта не атрымліваецца (напрыклад, як у Мужыка, галоўнага героя паэмы-трагедыі «Адвечная песня»). Паэт спрабуе ўзаемазвязаць прагу да шчасця з неабходнасцю ўнутранага змянення чалавека. Гатоўнасць да змагання з'яўляецца вызначальнай для пераходу асобы ў новую якасць. У некаторыя творы ўключаны пытанні пра будучыню, якія застаюцца адкрытымі, напрыклад: «Ты ж кудой пойдзеш, унук?..» [5, т. 3, с. 65] (верш «Бледныя буднія дні…», 1912).

Будучыня роднага краю ўспрымаецца і паказваецца Янкам Купалам як ідэальны светлы час паўнавартаснага і шчаслівага жыцця беларускага народа, пра які марыць лірычны герой многіх твораў. Аптымістычныя радкі з выказваннем аўтарскіх памкненняў, жаданняў і мар можна сустрэць і ў ранняй лірыцы і ў лірыцы савецкага часу. Пры гэтым сустракаюцца і песімістычныя роздумы паэта пра будучыню, найбольш у перыяд Першай сусветнай вайны і пасля яе, калі жыццё беларусаў стала хісткім і няпэўным (вершы «Як цені» (<1918>), «У лесе» (1926) і інш.). У многіх радках гэтых твораў гучаць аўтарскія запытанні, бо далейшае развіццё падзей з'яўляецца невядомым, выказваюцца сумненні: ці здолее тутэйшы народ пайсці па правільным шляху? Падобную тэму асэнсоўвалі і М. Багдановіч (верш «Народ, Беларускі Народ!..»), і Якуб Колас (зборнік «Казкі жыцця»). Асабліва ўзмацнілася трывога ў купалаўскіх роздумах пра жыццё і будучыню беларусаў падчас Першай сусветнай вайны. Невыпадкова ў вершы «Валачобнікі» гаворыцца, што няшчасныя беларусы чэзнуць, «у валачобнікі запісаны судзьбінай». Тут знаходзім і аўтарскае рытарычнае пытанне: «Ці ж нам ніколі ўжо прасветласці не знаць – // Гібець, гнісці й, не жывучы, канаць?» [5, т. 3, с. 202]. Адказ на яго павінна даць жыццё.

Паэт у вершы «1914-ты» задумваецца над тым, як будуць успрымаць наступнікі 1914 год, асэнсоўвае гэты год праз міфалагічную метафару: «Крывавы бог крывавыя ахвяры // Сабраць павінен з свету дачыста» [5, т. 3, с. 218], кажа, што «прыйдзе іншы год» і будзе напісаны бескрывавы закон іншым Богам-рокам. Такім чынам у фінале твора выказваецца аўтарская надзея на заканчэнне вайны.

У многіх творах Янка Купала ўздымае нацыянальныя пытанні, задумваецца аб гістарычным лёсе беларусаў і роднай мовы, імкнецца абудзіць і сцвердзіць нацыянальную годнасць суайчыннікаў. У. Гніламёдаў назваў паэта «апантаным беларускім лёсам», адзначыў, што «тэма дзяржаўнага і духоўнага самасцвярджэння беларускага народа – ад самага пачатку купалаўская. Яна ўзыходзіць да перыяду дарэвалюцыйнай творчасці (верш "Маладая

Беларусь" – 1912 г. і інш.). Гістарычнае быццё народа, яго шлях з мінулага ў будучыню стаў крыніцай творчага натхнення Купалы ў "Безназоўным"» [4, с. 133], падкрэсліў, што «кніга "Спадчына" з незвычайнай лірычнай усхваляванасцю і паўнатой адлюстравала карціну нацыянальнага быцця беларускага народа ў пераломна-кульмінацыйны момант яго гісторыі» [4, с. 124].

Так, ужо ў раннім вершы «Ворагам Беларушчыны» (1907) з'явіліся матывы, якія потым былі развітыя ў многіх іншых пазнейшых творах класіка: матыў уваходжання беларусаў у славянскую супольнасць («І беларус можа змясціцца // Ў сям'і нялічанай славян!» [5, т. 1, с. 134]), матыў асуджэння ворагаў Беларушчыны і іх ганебных учынкаў («Не пагасіць вам праўды яснай: // Жыў беларус і будзе жыць!» [5, т. 1, с. 134]), выказванне мары пра незалежную Беларусь і імкненне абудзіць нацыянальную самасвядомасць народа: «К свабодзе, роўнасці і знанню // Мы працярэбім сабе след! // І будзе ўнукаў панаванне // Там, дзе сягоння плача дзед!» [5, т. 1, с. 134]. Беларусацэнтрызм увогуле быў характэрны для ўсёй нашаніўскай паэзіі: менавіта «…нашаніўцы <…> пачалі разглядаць праблемы, звязаныя з беларускім нацыянальным адраджэннем, скрозь прызму універсалізму, а нацыянальную драму Беларусі ўбачылі як частку сусветнай драмы» [2, с. 112], – адзначыў П. Васючэнка. На думку даследчыка, «паэт з абвостраным пачуццём радзімы, Купала бачыў нацыянальнае жыццё кожнага народа як адзін са спосабаў гарманізаваць разлад паміж глабальным і прыватным, універсальным і асабовым» [1, с. 15–16], а «ваганні яго творчага настрою былі, як правіла, звязаны з станам беларускага нацыянальнага адраджэння» [1, с. 18].

Малюнкі шчаслівай будучыні беларусаў адлюстраваны ў многіх творах. Напрыклад, у раннім польскамоўным вершы лірычны герой кажа пра родную зямлю: «Ты ў зяляніне, уся ў святле, ззяеш смела жыццём. // Бачу на тваёй прасторы прыўкрасныя пісанкі, // Любасці і братэрства бачу ясныя ранкі» [5, т. 1, с. 415] (верш «Зямля…»), але, на жаль, усё гэта толькі ў ягоных снах. Светлая будучыня перадаецца праз метафары: «весела узойдзе рунь святлянай славы» [5, т. 2, с. 138] (верш «Роднае слова», 1910); «Вольны, ясны мкне прасвет» і «новы ўсход», які «ў хаты // Смела гляне» [5, т. 2, с. 103] (верш «Прафесару Б. Эпімах-Шыпілу з новым 1910 годам»), новае жыццё [5, т. 2, с. 34–35] (верш «Беларушчына») і скразную для нашаніўцаў сімвалічную вобразнасць: «Глянуць *зоры* на прасторы, // *Сонца* стопіць *путаў лёд*» [5, т. 2, с. 103] і інш.

У нашаніўскі перыяд творчасці Янкі Купалы часта гучалі нацыянальна-вызваленчыя матывы, адкрытыя і прыхаваныя заклікі да змагання, якое павінна змяніць жыццё: «Шлях залаты працярэбім, // Зорна ўзнясёмся ў высоты // Вышай няпраўды, няславы, // Вышай пакутных балотаў» [5, т. 2, с. 153] (верш «Песня і сіла», <1906–1910>). Вобраз залатога шляху ўвасабляе пераход у шчаслівую будучыню. Падобныя вобразы сустракаем і ў іншых творах: «другія пуціны жыцця» [5, т. 2, с. 55] (верш «Памяці Т. Шаўчэнкі», 1909), «вясёлкавы шлях», «шлях новы» [5, т. 4, с. 91] (верш «У вырай!», 1920). Будучыня ў лірыцы Янкі Купалы часта перадаецца праз сімвалічныя вобразы, якія звычайна абазначаюць адухоўленыя паняцці: напрыклад, у вершы «Зашумеў лес разгуканы» (1906) знаходзім наступнае апісанне: «Доля, воля ясным сцягам, // Зоркай ўзыдзе мілай» [5, т. 1, с. 77]. Паэт запэўнівае чытачоў: «…скора // Гэты дзень настане, – // Ўжо ўздымае людаў мора // Праўды панаванне» [5, т. 1, с. 77] і выказвае веру ў народную перамогу. У вершы «З надзеяй гаротнай…» (1908) паэт дзеліцца з чытачом сваёй марай пра старонку, дзе будзе раданае жыццё, як сонца, і шчаснае. З гэтым вершам тэматычна і вобразна звязана некалькі напісаных пазней твораў, у якіх вобраз Беларусі персаніфікаваны ў вобразе жанчыны, якая расказвае пра сваё цяжкае мінулае (верш «Ужо днее», <1908>) і цяперашнюю славу (верш «Маладая Беларусь», 1909), або ў якіх лірычны герой кліча сваю старонку-маці прачнуцца і выйсці спаткаць вясну («Выйдзі…», 1912). Жаданую будучыню творца пераносіць у цяперашні час, паказвае тое, што ўжо адбылося ці хутка адбудзецца (падобны мастацкі прыём М. Бахцін назваў «гістарычнай інверсіяй часу»). Пры гэтым «змена пунктаў погляду рэалізуе прынцып дапаўняльнасці, дае магчымасць бачыць адно і тое ж больш ёмка, шматгранна, больш аб'ектыўна» [6, с. 142].

Паступова ўзнікае вобраз грамады як спраўджанай мары паэта пра аб'яднанне беларускага народа ў моцнае і непадзельнае адзінства (вершы «А хто там ідзе?» (<1905–1907>), «Вялікдзень» (1909), «Гэй, наперад!» (1911) і інш.). Пры гэтым жаданае будучае часта выдаецца за рэальнасць: напрыклад, у вершы «Беларушчына» паказваецца абуджэнне народа, выкліканае адчуваннем змен, якія адбыліся ў агульных настроях на пачатку XX стагоддзя: «Час ішоў.

К жыццю новаму клікі пачуліся; // Ўсе народы паўсталі на бітву за права свае» [5, т. 2, с. 34]. Таму і сон Беларушчыны (паэт звяртаецца да яе на «ты») змяніўся на яву: «Ты – як спала – ускрэсла, твае дзеці прачнуліся. // Твой народ, ты сама ўсталі новае строіць жыццё» [тамсама]. Або ў вершы «Маладая Беларусь» маладая краіна кажа пра сябе: «Вызываная праўдай, таптанай, жывой, // Я ўзышла, расцвіла непагаслай зарой» [5, т. 2, с. 47], цяпер яна стала ўладаркай і выказвае веру, што не загіне, бо не загінула раней. Як бачна, паэт выкарыстоўвае вобразы святла, непагаслай, праўдзівай зары для стварэння метафары светлай будучыні. Калі краіна стане шчаслівай, зменіцца і жыццё яе людзей: «Я святла іскры ў думках бяздольных засею, // Аднаўлю сэрцы іхныя гартам, надзеяй, // Пакажу ім жыцця іх праўдзіву зару, // Па развалінах нову ўсябытнасць ствару» [5, т. 2, с. 47–48]. У аўтарскай рэфлексіі сінтэзаваны мінулае, сучаснасць і будучае. Верш мае колавую кампазіцыю – першая і апошняя строфы ў ім нават аддзелены графічна. У фінале твора паэт заклікае Беларусь уставаць «з паніжэння, з пацёмкаў» і выказвае пажаданне: «Хай жа будзе нязможана ўлада твая! // Гэй ты, гэй, Беларусь маладая мая!» [5, т. 2, с. 48]. У творы «З павяўшай славы…» (1919) паэт паказаў магчымасць пераходу ад сну да новай рэчаіснасці: каб збылася ягоная мара пра адраджэнне, патрэбна, каб голас народа зліўся ў адзінае «мы»: «мы зложым песню, зложым сказ» і «зайграем свету ў дружны хор», раскажам пра сябе, сваё жыццё. Замест сну ўсё «паўстане яваю жывой, // І светам блудным здрыгане, // І панясе скрозь светач свой // Ад краю ў край, між спячых сіл, // Аж там – да бацькаўскіх магіл!» [5, т. 4, с. 58].

Варта асобна адзначыць створаны паэтам вобраз вялікага народнага сходу: у вершы «Час!» (1918) творца заклікае народ паўстаць за Бацькаўшчыну-маці і ісці на сход. Гэты ж вобраз сустракаем і ў драме «Раскіданае гняздо» (1913). У савецкі час у творчасці Янкі Купалы ўзнікае вобраз камуны як увасабленне светлай будучыні Беларусі. Гэты вобраз ёсць і ў творчасці У. Маякоўскага. У. Гніламёдаў адзначыў, што ў той час у савецкай літаратуры быў створаны культ паэзіі У. Маякоўскага [гл. 3, с. 109]. Купала гаворыць, што «забуяе ў славе буйнай, // Зазвініць залатаструнне // Родны Край адной камунай…» [5, т. 4, с. 102] (верш «На смерць Сцяпана Булата», 1921).

Услед за Ф. Багушэвічам і Цёткай Янка Купала асэнсоўвае тэму паэта і паэзіі, сваю «пяснярскую місію» і лёс таленавітых людзей, іх служэнне роднаму народу і краіне, што з'яўлялася адной з магістральных тэм беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя, калі было важна сваімі творамі і сваёй грамадзянскай пазіцыяй аказваць уплыў на жыццё. Вялікая роля ў справе нацыянальнага адраджэння належыць песнярам і прарокам (вершы «Прарок» (1912), «Песняру-беларусу» (1909) і інш.). Заклік да творцаў быць правадырамі (дударамі-званарамі) знаходзім у вершах «Гусляр» (<1906–1910>), «Песня званара» (1909) і інш. У паэме «Курган» (1910) Янка Купала паказаў веліч подзвігу гусляра, а свае два першыя зборнікі паэзіі з вялікай адказнасцю, услед за папярэднікамі, назваў «Жалейка» і «Гусляр». Чаканне прыходу прарока, каб сабраў у адну сям'ю ўсю Беларусь, песняра, каб абудзіў народ, воіна («ваякі»), каб адстаяў сваю Бацькаўшчыну, і Уладара, які пад беларускім сцягам адбудаваў бы свой «збураны пасад», бачым у вершы «Паўстань…» (1919).

Родная мова для паэта – найвялікшая каштоўнасць, якую неабходна зберагчы і перадаць наступным пакаленням. Так, у вершы «Роднае слова» («Пад навалай крыўдаў многія сталецці…») (1910) паэт сцвярджае, што беларуская мова («бацькаўскае слоўца») будзе вечна жыці: «І радзімым словам рукой мазалістай // Беларус упіша на старонцы чыстай // Кнігі ўсіх народаў важна, ў непрымусе // Сумную аповесць роднай Беларусі» [5, т. 2, с. 138]. А ў фінале другога аднайменнага верша (з падзагалоўкам «Магутнае слова, ты, роднае слова…») (1908) заклікае:

Загнанае слова, ты, роднае слова!
Грымні ж над радзімай зямлёй:
Што родная мова, хоць бедная мова,
Мілей найбагатшай чужой! [5, т. 2, с. 35].

Асэнсоўваючы падзеі мінулага, паэт раскрывае ў лірыцы ідэю сувязі часоў, пераемнасці пакаленняў, станоўча ацэньвае дзейнасць газеты «Наша ніва», кажа, што ад цяперашніх думак залежыць прыход светлай будучыні: «З добрых думак, што мы кінем // На сваім дзірване, // Будзе ўнукам нашым жніва – // Доля, панаванне. // Беларускаю рукою // Светлай праўды сіла //

Славу лепшую напіша // Бацькаўшчыне мілай. // Зацвіце яна, як сонца // Пасля непагоды, // Ў роўнай волі, ў роўным стане // Між усіх народаў» [5, т. 3, с. 50–51]. Гэты верш таксама з колавай кампазіцыяй: у ім двойчы сцвярджаецца, што «не загіне край забраны, // Покі жывы людзі» [5, т. 3, с. 51], і падмацоўваецца прыёмам сінтаксічнага паралелізму: непарыўная сувязь людзей са сваім краем суадносіцца з непадзельнасцю зорак і неба.

Добрыя справы патрыётаў будуць мець працяг, а іх імёны застануцца бессмяротнымі – матыў, які гучыць у многіх купалаўскіх вершах-прысвячэннях. Гістарычная тэма, на наш погляд, была вельмі блізкай паэту. Ён пранікліва ўспрымаў не толькі падзеі тагачаснай рэчаіснасці, але і глыбока цікавіўся даўнінай, імкнуўся зразумець і растлумачыць яе таямніцы, вылучыць у ёй станоўчае і адмоўнае, заканамернае і выпадковае. Паэт хацеў давесці сваім сучаснікам-чытачам неабходнасць ведання свайго мінулага, разумеў, што гэта з'яўляецца адным са шляхоў умацавання іх нацыянальнага духу і гонару за сваю краіну. Велічныя і гераічныя старонкі беларускай гісторыі паэт лічыў неабходным паказаць у якасці маральнага ўзору паводзін. Невыпадкова творца падкрэсліваў, што беларуская мова мае сваю даўнюю гісторыю. Яна прайшла праз стагоддзі, шмат выцерпела, і пры гэтым, як піша Янка Купала: «Адно ты нам, слова, засталося верным, // Каб вясці з упадку к радасцям нязмерным» [5, т. 2, с. 136] (верш «Роднае слова»). А ў вершы «Маладая Беларусь» яшчэ ў 1909 годзе паэт прароча сцвярджаў: «Грамадзянская згода, супольнасць загосце, // Аж усцешацца прадзедаў цені і косці, // Слоў унука не зглушыць ніякі прымус, // Што ён роднай зямлі верны сын, беларус» [5, т. 2, с. 48]. Матыў пераемнасці пакаленняў гучыць і ў пралогу паэмы «Магіла льва» (1913):

Нам продкаў кемнасць захавала
Шмат весцяў дзіўных з быўшых год,
Хоць гэтых весці ўжо нямала
Ў няпамяць кінуў сам народ. <…>

Збіраць пачнем зярно к зярняці,
Былое ў думках ускрашаць,
Каб быт на новы лад пачаці
І сеўбу новую пачаць.

Пачнём дакапывацца самі
Разгадкі нашых крыўд і бед,
Што леглі цёмнымі лясамі
На нашай долі з даўных лет [5, т. 6, с. 91].

Як вядома, адной з галоўных задач беларускіх пісьменнікаў на пачатку XX стагоддзя, і найперш газеты «Наша ніва», было асветніцтва. Тагачасныя дзеячы нацыянальнага Адраджэння разумелі неабходнасць атрымання адукацыі сялянамі, імкнуліся дапамагчы павысіць іх інтэлектуальны ўзровень і абудзіць іх грамадзянскія пачуцці. З існаваннем гэтай праблемы і было звязана з'яўленне твораў класікаў пра «цёмнага селяніна», якога патрэбна навучыць грамаце. Асэнсоўваючы гэту тэму, Янка Купала прароча ўскладае вялікую надзею на моладзь, якая пабудуе новае жыццё, здолее вырвацца з «замкнёнага кола» сялянскага ладу жыцця. Дзеці і моладзь у яго творах увасабляюць ідэальныя рысы будучых беларусаў: высокі інтэлект, адукаванасць, адкрытасць новаму, наяўнасць актыўнай грамадзянскай пазіцыі. Паказальны ў гэтым плане верш «Моладзі» (1914):

На цябе, наша моладзь, надзея
Нашай сумнай забранай зямлі;
Твой арліны палёт цьмы развее
І запаліць веквечны агні. <…>
Ты на бацькаўскім, моладзь, кургане
Узнясеш нездабыты пасад,
Што расточыць сваё панаванне
На ўвесь край, дзе сягне твой пагляд [5, т. 3, с. 190–191].

Моладзь не будзе верыць у заломы, ёй не страшныя «злыя ворагі, іх варажба», барацьба і загартаванасць маладых людзей «выкрасяць» з грому і маланак долю і праўду. У фінале твора адкрыта гучыць актуальны і сёння заклік да моладзі: «Бяры светач, ідзі за судзьбінай, // Ідзі з словам святым: Беларусь!» [5, т. 3, с. 191]. У творах савецкага часу паэт паказвае, як маладое пакаленне ўліваецца ў новыя рэаліі жыцця (вершы «Хлопчык і лётчык» (1935), «Алеся» (1935), «Піянерскае» (1926) і інш.). Адна з метафар, праз якую ўспрымаецца будучыня, – суд патомкаў ці новых пакаленняў (верш «І прыйдзе», 1926).

Пра беларускую паэзію савецкага часу У. Гніламёдаў адзначыў наступнае: «У адпаведнасці з часам, у сярэдзіне і другой палавіне 20-х гадоў у паэзію ўваходзяць тэмы індустрыялізацыі, перабудовы вёскі, калектыўнай працы, новай маралі і этыкі, якія пераасэнсоўваліся пад класавым пунктам гледжання. Купалаўскі рамантызм з яго ўсёчалавечай скіраванасцю спакваля страчвае эмацыянальную разнастайнасць і адчуванне рэчаіснасці – стыль паэта губляе свой аб'ём і шматграннасць, у ім пераважае публіцыстычна-дэкларатыўны тон. У паэзіі Купалы ўсё часцей даюць пра сябе знаць рысы рытарычнасці, ілюстрацыйнасці» [3, с. 103]. «А ў цэлым на змену ранейшым ідэалам і страсным адраджэнскім памкненням прыйшла апатыя. Пад сцягам сацрэалізму адбывалася ўніфікацыя паэзіі, сцвярджэнне агульшчыны» [3, с. 109].

Нашаніўскі сімвалічны вобраз руні зведаў трансфармацыю: «І руняй савецкай уквецяцца гоні» [5, т. 5, с. 17], – чытаем у вершы «Настане такая часіна» (1932). Асэнсаванне змен, якія адбываюцца з вясковым укладам жыцця, знаходзім у вершы «Сыходзіш, вёска, з яснай явы…» (1929). Многія творы Янкі Купалы савецкага перыяду вызначаюцца лакіроўкай рэчаіснасці: паэт піша, што ўсё дасягнута, усюды стала добра. Шмат вершаў было напісана з нейкай нагоды, а ў 1930-я гады ў творах пачынае фігураваць імя Сталіна. Паэт верыць, што працоўныя ўсіх краін некалі створаць сусветную Камуну (верш «Вялікаму Кастрычніку», 1932), быццам падказвае, пра якія змены раскажа будучы гісторык, і сярод іх: «Як яна, бальшавіцкая партыя, // Каб датла зруйнаваць стары свет, // Барацьбою зацятай, упартай, // Сваю ставячы голаў на карту, // Дасягла недасяглых пабед» [5, т. 5, с. 14] (верш «Песня будаўніцтву», 1931). Часам у купалаўскіх творах сённяшні чытач можа вычытаць іранічны падтэкст: напрыклад, у фінале верша «Трэба нам песень» (1934) паэт вобразна называе галоўнага будаўніка сацыялістычнай рэчаіснасці Сталіна кампазітарам.

У савецкі час быў лозунг: працаваць дзеля будаўніцтва светлай будучыні, камунізму. Калі тагачасным пакаленням жылося дрэнна, яны пераадольвалі цяжкасці ў імя шчаслівай будучыні дзяцей і ўнукаў. «У грамадстве страцілася ідэя першароднай свабоды, што ідзе ад Бога, паколькі Бога адверглі. Любоў да Бога замянілася любоўю да партыі, яе лідара, перастаўшы быць нечым сакральным, трансцэндэнтным, слугавалі не Богу, а радзіме (з абавязковай прыстаўкай «савецкая»), партыі. Пад шчасцем разумелі працу, адданасць агульнай справе. Такім чынам, значэнне вышэйшых маральных ідэалаў перамясцілася са сферы ўзвышанага, сакральнага, духоўнага ў сферу ідэйнага, квазісакральнага» [7, с. 20–21].

Сам Купала называў свае вершы савецкага часу «дрындушкамі», пра што нават пісаў П. К. Панамарэнка ў лісце да І. В. Сталіна. На наш погляд, для сучаснага чытача творчасць класіка савецкага часу таксама ўяўляе каштоўнасць, у творах паэта адчуваецца моцны аўтарскі талент, сустракаюцца як цікавыя вершы, так і проста значныя страфы і радкі. Хоць, безумоўна, унутранае адчуванне свабоды, якое з'яўляецца неабходным і неад'емным для кожнага творцы, відавочна замянілася стрыманасцю і змушанасцю. Савецкая сістэма нівелявала крытэрыі мастацкай праўды, што, на жаль, адбілася на творчасці некалькіх пісьменніцкіх пакаленняў.

Такім чынам, у творчай спадчыне Янкі Купалы раскрываецца аўтарскі нацыянальны ідэал. Купалаўскі вобраз грамады натуральна перарастае ў вобраз вялікага сходу, а ў савецкі час змяняецца на вобраз камуны. Адраджэнскія вобразы-сімвалы, створаныя Янкам Купалам, сталі ключавымі для ўсёй беларускай літаратуры нашаніўскага перыяду. Паэт імкнуўся глыбока асэнсаваць суадносіны мінулага, сучаснасці і будучыні, падрабязна раскрыць веліч гераічных старонак беларускай гісторыі, спасцігнуць сутнасць даўніх падзей. У ранні перыяд творчасці зарадзілася мара пра светлую і шчаслівую будучыню беларускага народа, роднай мовы і Беларусі – ідэя, якая дамінавала на працягу ўсяго творчага шляху класіка. Паэт разумеў, што яго мару ажыццявіць нялёгка, патрабуюцца высілкі многіх людзей, што найперш неабходны змяненне ўнутранага свету самога беларуса і рост яго нацыянальнай самасвядомасці.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Васючэнка, П. Ад тэксту да хранатопа: артыкулы, эсэ, пятрогліфы / П. Васючэнка. – Мінск: Галіяфы, 2009. – 200 с.
2. Васючэнка, П. Літаратурны твор як шыфр. Нашаніўская традыцыя іншасказу і яе актуалізацыя ў сучаснай беларускай літаратуры / П. Васючэнка // Произведение искусства – предмет анализа критика: сб. науч. тр. / под ред. Т. Д. Орловой. – Минск: БГУ, 2009. – Вып. 1. – С. 110–115.
3. Гніламёдаў, У. Ад даўніны да сучаснасці: нарыс пра беларус. паэзію / У. Гніламёдаў. – Мінск: Маст. літ., 2001. – 246 с.
4. Гніламёдаў, У. В. Янка Купала: новы погляд / У. В. Гніламёдаў. – Мінск: Нар. асвета, 1995. – 176 с.
5. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1995–2003. – Т. 1–6. (Тут і далей цытаты з мастацкіх твораў падаюцца паводле гэтага выдання з пазначэннем адпаведнага тома і старонкі.)
6. Лебедева, Т. Г. Художественное время и предвидение в прозе Ю. Трифонова / Т. Г. Лебедева // Мировоззренческие вопросы предвидения и времени: межвуз. науч. сб. / редкол.: В. Н. Ярская (отв. ред.) [и др.]. – Саратов: Изд-во Сарат. ун-та, 1986. – С. 139–147.
7. Нагапетян, К. Ж. Языковое бытие и исторические метаморфозы миропроговаривания русской культуры: автореф. дис. … канд. филос. наук: 09.00.13 / К. Ж. Нагапетян. – Омск, 2016. – 25 с.


*УДК 821.161.3(092 Я. Колас)*

## МАСТАЦКАЯ ДЭТАЛЬ ЯК ПРЫЁМ ПСІХАЛАГІЗМУ Ў ПРОЗЕ ЯКУБА КОЛАСА

**Т. М. Тарасава**

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*tamaratarasava@gmail.com*

Разглядаецца роля і функцыя мастацкай дэталі ў «малой» прозе Якуба Коласа (на прыкладзе апавяданняў «Адукацыя» і «Хатка над балотцам»). Аналіз дэталяў раскрыў талент Коласа-апавядальніка, змястоўнасць яго малой формы, здольнасць пісьменніка ў невялікім творы паставіць не толькі маштабную праблему сацыяльнага плана, але і паказаць, як унутраны свет чалавека ўвасоблены праз карціны свету знешняга.

*Ключавыя словы:* мастацкая дэталь; апавяданні Якуба Коласа; псіхалагізм; мікрадэталь; мікрасітуацыя.

## THE ARTISTIC DETAIL AS A METHOD OF PSYCHOLOGISM IN THE PROSE OF YAKUB KOLAS

**T. M. Tarasava**

*Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*
*Minsk, Republic of Belarus*
*tamaratarasava@gmail.com*

The role and function of the artistic detail in Yakub Kolas' stories (on the example of the stories "Education" and "The House over the Swamp") is considered in the article.

The analysis of the details revealed the talent of Kolas the storyteller, the depth of his stories, the ability of a writer to set large-scale social problems. The writer could also show how the inner world of a man is embodied through the pictures of the external world.

*Key words:* artistic detail; stories by Yakub Kolas; psychologism; microdetail; microsituation.